Казкі Янтарнай краіны

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч

SHOUT
SHARE
IT

- Уладзімір Караткевіч
  -
  - Казка пра срэбнага пеўніка
  - …Відземскую казку
  - …Казка пра янтарны палац
  - …Казка пра чалавека, які ішоў у пекла
- notes
  - 1

Уладзімір Караткевіч
Казкі Янтарнай краіны

Паміж латгальскімі азёрамі і Балтыйскім морам ляжыць Янтарная краіна.

І ўсё на гэтай зямлі мае янтарны колер.

І валасы ў людзей, і свежыя зрубы, і нават піва.

І вось у канцы мая, калі цвіце ружовы глог, мне нясцерпна захацелася ўбачыць гэтую краіну.

Калісьці ў казку адпраўляліся пехатою, але цяпер іншы час. Таму я паехаў у мінскі аэрапорт і там абмяняў некаторую колькасць грашовых знакаў на білет "Мінск — Рыга", у якім касірка акуратна прапісала маё прозвішча, забыўшыся чамусьці дапісаць, што мне трыццаць адзін год і што я нежанаты.

Гэтым яна зламысна і падступна сапсавала мне ўвесь палёт, бо я вёз з сабою вялікую ляльку, і сцюардэса, падобная ў сваім венчыку на каралеву Поўначы, глядзела на мяне коса. Але я не крыўдую, усё было цалкам заканамерна: папера ёсць папера.

І вось самалёт нёс і нёс мяне над зямлёю, і скора раскінулася перад вачыма мора. Гэта была Янтарная краіна.

З аэрадрома я імчуся на таксі паміж чысцюткімі і добрымі дамочкамі прадмесця на сустрэчу са стольным горадам Лаймы — Рыгай, другім маім сэрцам.

Вы не ведаеце Рыгі? У Рызе самыя лепшыя ўсмешкі, самыя паважныя рабочыя, што з незапомных часоў носяць знак сваёй цэхавай годнасці — шапкі з нізкім казырком; у Рызе самыя ветлівыя і спакойныя прахожыя і самыя цудоўныя дзеці на зямлі.

І гэтага яшчэ мала. Калі на тым свеце будуць важыць дрэнныя і добрыя якасці гарадоў, калі Лайма разам з сівенькім панам богам возьмуцца за Рыгу, — хай яны кінуць на залатую шалю маю бязмежную любоў да цябе, сіні горад Янтарнай краіны. І тады ўсе расчуляцца і заплачуць і накрыюць гэты горад крыштальным купалам заўсёды блакітнага неба, каб ніхто не насмеліўся дыхаць на яго, як не дыхаю я. А дзе-небудзь у прыстойным месцы нябесны гарсавет прыб'е мемарыяльную дошку з надпісам: "Гэты горад любіў Караткевіч…"

Тут, у гэтым горадзе, жыве самы лепшы мой сябар Геронім Стулпан. Ён паэт, а гэта азначае — узвей-вецер, свістун, вятрак… Чакайце, гэта яшчэ азначае — пакутнік, галернік і чалавек бяссонных начэй.

Чорт стаптаў не адны лапці, пакуль падабраў нас у пару,

дзякуй яму за гэта. І мне добра ведаць, што ў мяне ёсць сябар — цяпер ужо да канца, добра глядзець у яго сінія і янтарныя вочы, добра пакепліваць з ягоных прыгод і патаемна ганарыцца ім.

І вось з ім, з гэтым добрым, цудоўным сябрам, мы выйшлі надвячоркам у стары горад.

Стары горад — гэта вузкія, пераплеценыя ў лабірынт вулачкі, высокія шэрыя дамы, у якіх колісь жыла, гандлявала, ела, піла, рагатала, як Гарганцюа, кпіла і кахала паўнакроўная старая Рыга. Дагэтуль з верхніх паверхаў — колішніх свірнаў і складаў — змеямі звісаюць перакінутыя цераз блокі канаты, на якіх падымалі ў склады тавар. Грыфельныя дамы, гладкі брук, крутыя дахі, мордачкі анёлаў на парталах — гэта старая Рыга.

У латышоў дрэнная фантазія. Упершыню я здагадаўся аб гэтым тут, па назвах вуліц. Не менш паловы вуліц старой Рыгі носяць назву Сарканас Гардэс. Як адрозніваюць іх самі латышы — гэта іх дзяржаўная і нацыянальная таямніца, бо гэтых вуліц — як пяску ў Рыжскім заліве. Вы выходзіце з дому, маючы цвёрды і варты ўсялякай ухвалы намер пагаліцца ў "фрызетаве" ля Парахавой вежы (там самыя ўважлівыя, прыязныя і адукаваныя цырульнікі ва ўсёй Латвіі), а потым пашпацыраваць па беразе Даўгавы. Здаецца, што можа быць лягчэй? Але так могуць разважаць толькі наіўныя людзі. Вы выходзіце з "фрызетавы", не ведаючы, што вуліца Сарканас Гардэс ужо закрыла сваю пастку. Можаце плакаць і маліцца, можаце абяцаць богу ніколі не курыць нічога, акрамя фіміяму для начальства, — нічога не паможа.

Вы пакідаеце надзейную плошчу, каб заглыбіцца ў завулкі… Вуліца Сарканас Гардэс… Вельмі добра! Адсюль трэба прайсці трохі далей, потым звярнуць направа, потым — налева… Стоп! Зноў вуліца Сарканас Гардэс… Другая… Пакідаеце за сабой метраў пяцьдзесят і выходзіце на вуліцу… Сарканас Гардэс… Трэцюю… Адчуваючы, што тут нешта не да ладу, ныраеце ў перпендыкулярна-радыяльную вулачку толькі для таго, каб праз пяць хвілін вынырнуць з яе на вуліцу… Сарканас Гардэс… Пасля гэтага заходу чалавек з гарадскімі нервамі звычайна кідаецца бегчы і выбягае на вуліцу… Сарканас Гардэс… Вы бежыцё і бежыцё, і паўсюль вас ветліва сустракае вуліца Сарканас Гардэс… Гэта як у страшным сне… І тады вы сядаеце на панель і пачынаеце жаласна і ціха клікаць маму…

…Калі я адчую набліжэнне смерці, я абавязкова пасялюся на вуліцы Сарканас Гардэс — і хай тады Касая пашукае мяне. Трасцу яна мяне знойдзе. А я буду пасмейвацца і пісаць усё новыя і новыя раманы…

…На вудацы Сарканас Гардэс.

І ўсё ж я люблю стары горад. Некалі на яго вуліцах пакутаваў

лепшы з паэтаў-урбаністаў дваццатага стагоддзя Аляксандр Чак. Ён любіў Зязюліну горку — адзінае высокае месца ў горадзе. Адтуль ён спрабаваў зразумець тваю душу, старая Рыга, зірнуць з вышыні ў твае глыбіні.

Рыга, ліхалецце паэтаў! Рыга, любоў мая!

…А цяпер — ціха, мой спадарожнік, ціха, бо я маю заняцца недазволенай справай: хачу паказаць табе саборы Рыгі. Гэтую ерась катэгарычна забараніў мне рэдактар. А паколькі я збіраюся надрукаваць гэтыя нататкі ў ягоным часопісе, трэба быць мудрым, як змій, і слухацца. Таму я нічога не скажу ні пра гучны, страшны, як харал дэманаў, Домскі арган, ні пра самую званіцу Дома, ні пра цудоўныя вітражы, праз якія льецца ў сабор чырвонае, як віно, і жоўтае, як янтар, святло. І дарэмна я не скажу аб вітражах, бо беларускія майстры славіліся імі некалі на ўсю Еўропу, а цяпер гэтае тонкае мастацтва занядбалі на нашай зямлі. І толькі Прыбалтыка і дагэтуль любіць, удасканальвае, развівае далей цудоўны "куншт", які дазваляе бачыць свет больш вясёлкавым, чым ён ёсць на самай справе. А гэта ж уласціва кожнаму з нас: нездарма ж мы на світанку жыцця любілі глядзець на зямлю праз каляровыя шкельцы.

Ніякага дачынення да гістарычнай трухі не мае ўнутраны дворык рыжскага гістарычнага музея, і таму я магу расказаць аб ім болын падрабязна. Гэта маленькі дворык, абкружаны гатычнымі арачкамі, увесь чырвона-цагляны і бела-мармуровы. Над ім блакітнае неба і снежныя рэдкія аблокі, а ў ім, як нявеста, квітнее белая чаромха і пяшчотна-ліловым полымем гарыць бэз.

Рэнесанс памёр, як бы мы ні сумавалі на ім. Ад яго асталіся толькі кнігі і гэты дворык ля Домскай званіцы. І таму, як бы ты ні чакаў у гэтым дворыку сваёй Джульеты, на дне сэрца жыве сум.

І мімаволі зайздросціш срэбным пеўням на шпілях дамоў і званіц, бо яны бачылі ўсё гэта, і перажывуць цябе, і будуць вітаць тваіх прапраўнукаў.

Так, тут нідзе няма на шпілях агіднага знака крыжа, сімвала нялюдскай пакуты і прыніжэння. На ўсіх шпілях Рыгі дзёрзка ўзносяцца ў неба нахабныя, вясёлыя і звонкія пеўні. Яны чхаюць на ўсё, смяюцца з круганоў і хмар, яны толькі што не спяваюць. А можа, мы проста не чуем іхніх спеваў з зямлі?

Пеўнік — сімвал яснага світання! Пеўнік — сімвал нараджэння новага дня!

Менавіта такі пеўнік сядзеў калісь і на званіцы Пятра, самай высокай драўлянай званіцы на зямлі. Пра яго прыгоды раскажа першая янтарная казка…

Казка пра срэбнага пеўніка

Скрып… скрып… скрыпянец… Што азначае: "Сядзеў пеўнік на шпілі…" І не дзе-небудзь, а на шпілі званіцы Пятра. А званіца гэтая была самая высокая драўляная званіца на зямлі, а значыць — і ў Рызе.

І вось што казалі латышскія сяляне пра званіцу Пятра: "Не забудзь зняць шапку перад Пятром. Усё адно Пётр яе скіне".

І як жа было пеўніку не ганарыцца, стоячы вышэй за ўсіх і першым з усіх пеўняў на зямлі сустракаючы сонца? Ён і ганарыўся, тым больш што быў тады зусім маладзенькі: толькі год ці два назад выкаваў яго з чыстага звонкага срэбра юнак Лат, самы здольны мастак ва ўсёй Рызе.

А было гэта чатырыста год назад, і латышам тады дрэнна жылося ў сваім горадзе. Кіравалі горадам епіскап і яго святое апалчэнне, што насіла пад плашчом чысціні акрываўленыя даспехі, а на поясе, побач з ружанцам, прагны рыцарскі меч.

Людзі плакалі і лаяліся, але да пеўніка ўсё гэта не даходзіла. Што яму было, па маладосці год, да людзей? Ён цікавіўся толькі адным Латам, як мы цікавіліся б лёсам далёкага бацькі, пазнаваў яго ў чалавечым мурашніку, сачыў за ім, радаваўся, калі Лат глядзеў на яго.

— Бессардэчны, — казалі пра нашага пеўніка другія пеўні, што стаялі бліжэй да слёз і гневу зямлі.

Яны не ведалі (ды і сам пеўнік не ведаў), што не можа не быць сэрца ў творы вялікага майстра, што сам майстар не можа не даць часткі свайго сэрца свайму твору, што пеўнік проста дрэнна чуе, пра што гнеўна спявае зямля. А між тым яму кожны раз хацелася заспяваць для ўсіх там, унізе, калі першы прамень сонца падаў на яго. Тады нешта цёплае варушылася ў яго срэбных грудзях. Толькі ён не ведаў, што гэта сэрца і што яно стане вялікае, калі ён пачуе песню зямлі.

І вось аднойчы, прачнуўшыся маёвым ранкам і зірнуўшы з вышыні на горад, пеўнік убачыў унутраны дворык ля Домскага сабора. Ніколі ён яму не здаваўся незвычайным, гэты дворык, але сёння пеўнік упершыню адчуў, колькі прыгажосці ў маленькіх арках, у басейне, у белым вэлюме чаромхі і ў ліловай дзёрзкасці бэзу… Яго гаспадар, яго Лат, быў у дворыку, і не адзін. Там была і дзяўчына. І Лат нагадваў дзёрзкі бэз, а дзяўчына — белую чаромху.

Пеўнік не ведаў, што дзяўчына была пляменніца самога епіскапа, што Лату небяспечна было быць там, дзе яна, бо ён

смерд. Пеўніка проста здзівіў незвычайны агонь у вачах юнака, і яму ўпершыню захацелася паслухаць, пра што яны там гавораць. А паколькі слухаць ён яшчэ не ўмеў, ён пачуў не ўсё.

— Я… цябе, — сказаў Лат. — Што ты хочаш, каб я зрабіў у славу тваю?

— Выкуй мне са срэбра такую ж зямлю, як гэтая…

— …як бог?

— Хіба не хопіць сілы?

— Хопіць, калі ты падорыш мне адзін…

І тут пеўнік убачыў, што іхнія дзюбы — ці як гэта там завецца ў людзей? — зліліся. Яму стала сорамна чагосьці, і ён апусціў срэбныя павекі.

Так здарылася, што першае слова, якое пачуў пеўнік, было слова любві. А калі такое здарыцца з істотай, тады вушы яе адкрываюцца для ўсіх галасоў зямлі. І на пеўніка раптам нахлынуў прыбой гукаў, і ён пачуў, як смяецца праз слёзы, кляне і лаецца зямля.

— Як жа я мог без гэтага? Як я мог не чуць? Я ж іхні! Мяне выкавалі там! Мала таго — я ж першы, першы з іх сустракаю сонца.

Ён слухаў, слухаў, і нешта вырастала, вырастала ў яго срэбных грудзях. За дзень яно вырасла так, што пеўніку стала балюча, і ён не ведаў, што зрабіць, каб суняць гэты пранізлівы, усеабдымны боль.

Застогне нехта ўнізе — як іголкай працінае.

І таму ён, праседзеўшы цэлы дзень з заплюшчанымі вачыма, нават узрадаваўся, калі прыйшла ноч, бо ўсім пеўням, як вядома, уначы належыць спаць.

"Засну і заўтра ўстану здаровы".

Але разбудзіла яго не сонца, бо хмары густа зацягнулі неба над Рыгай, а страшны крык соцень крумкачоў ды нейкая невядомая трывога.

…Узняў срэбныя павекі і ўбачыў на плошчы перад Домам людскі мурашнік. Чорныя постаці завіхаліся ля слупа.

…А над плошчай убачыў крумкачоў, што кружылі ў бурым небе. І неба было бурае, бо на плошчы раскладалі вогнішча. Чорныя людзі неслі да слупа сушняк, а ля слупа, прыкуты, стаяў Лат у сваім белым плашчы. Янтарныя валасы рассыпаліся па плячах, а янтарныя шалёныя вочы глядзелі ў бок дворыка, у якім не было — толькі пеўнік бачыў гэта — епіскапавай пляменніцы.

Пацягнуўся да ног Лата першы зыркі струмень агню. Але Лат маўчаў. Затое плакалі людзі, і пеўнік зноў адчуў нясцерпны боль.

Кружылі крумкачы.

Бедны пеўнік у трывозе замітусіўся на сваім прутку. Ён ведаў:

срэбныя пеўнікі не лётаюць і не крычаць. Яны могуць толькі нячутна гаварыць паміж сабою. Але ж Лат, але ж гаспадар не крычаў, хоць агонь пачаў лізаць край ягонага плашча. І ў чым ён быў вінен, гаспадар? Ён жа не ўкусіў тае, у дворыку, ён проста дакрануўся да яе сваёй дзюбай.

І тады пеўнік шалёна таргануўся на шпілі і адчуў, як з болем выйшаў з ягонага цела востры пруток. Дзіва, але крылы ўзняліся ў паветра, ножкі напружыліся і адштурхнуліся ад спрадвечнага седала.

Пеўнік паляцеў.

Ён падаў у сваім палёце, і вырасталі, рабіліся ўсё бліжэй постаці людзей на плошчы.

Першым ударам крылаў ён збіў полымя, што падбіралася да ног Лата. Агонь лізаў пеўніка, але ён не адчуваў пакут: унутраны боль быў мацнейшы. І людзі крычалі, вітаючы пеўніка, а ён збіваў полымя, і такая сіла тады жыла ў ім, што ён сваёй мяккай срэбнай дзюбкай разрываў цвёрдыя сталёвыя ланцугі, быццам яны былі з паперы.

Ужо не было агню — толькі дым, ужо не было ланцугоў — толькі пашматаныя кавалкі іх, а ён у ярасці змагаўся з тым, чаго не існавала. І Лат, перш чым знікнуць у натоўпе, узяў пеўніка і высока падкінуў яго:

— Ляці!

І той паляцеў на сваё месца, цяжка, з натугай, штохвіліны зрываючыся, бо пеўні — а тым больш срэбныя — лётаюць дрэнна.

Варта не паспела схапіць яго, ён зноў апусціўся на сваё месца. А там яго ўжо ніхто не мог дастаць, бо шпіль Пятра быў такі высокі, што з яго было відаць усю Янтарную краіну…

Часам на яе абшарах пеўнік бачыў Лата: суровага, заўсёды гатовага да бітвы. Пеўнік не здзіўляўся, што гаспадар цяпер пасталеў. Ён і сам ужо быў не бліскучы, а закураны, і дзюбка ў яго была чырвоная, бо ён скрываваіў яе аб ланцугі. Лат і ён былі цяпер — пара. І таму, калі пеўнік бачыў, што да Лата крадзецца нечаканая бяда, ён голасна крычаў на ўсю краіну:

— Лат, кокерыке, Лат! Вораг з захаду!.. Кокерыке! Лат, вораг з поўначы!.. Кокерыке! Кокерыке!!!

І ворагі нічога не маглі зрабіць з ім.

Выгнаныя з латышскай зямлі, яны дзвесце год спадзяваліся адпомсціць, і ўрэшце гэта ім удалося, у сорак першым, калі яны падступалі да Рыгі. Трывожна крычаў пеўнік на шпілі Пятра — і вось праз многа год адзін з нашчадкаў епіскапа стрэліў па ім з гарматы. Снарад пацэліў у званіцу, і яна, палаючы, усім целам рухнула на зямлю разам з гарластым вестуном раніцы. У рыжскім музеі ёсць здымак: званіца падае ў агні, а ў неба ляціць палымяны

пеўнік.

Лат адпомсціў ворагу і прагнаў яго з Янтарнай зямлі, бо Лат вечны, ён не памірае. І прыйдзе, скора прыйдзе ўжо час, калі чалавек з янтарнымі валасамі, вечны Лат, адновіць званіцу і пасадзіць на яе шпіль новага, яшчэ лепшага пеўніка.

І давеку будзе — скрып… скрып… скрыпянец… — сустракаць сонца срэбны пеўнік над Рыгай.

А што ж, вядома, так і будзе. І я, падарыўшы сабе і вам гэтую казку, толькі цяпер падумаў, што лёс кожнага сапраўднага паэта — гэта лёс нашага пеўніка. Калі ён сапраўдны — ён першы сустракае раніцу і першы крычыць, калі вораг з'яўляецца на мяжы ці нават у сэрцы суайчынніка.

І ніхто не ведае, што яго сэрца баліць за ўсіх.

А калі ўсё добра — ён весела круціцца на сваім прутку і бязмэтна ззяе, каб радаваць легкаважнае сэрца юнака, які вяртаецца са спаткання разам з сонцам. І яму ад гэтага добра.

Некалькі год таму я і Геронім паехалі ў этнаграфічны музей. Латышы — малайцы: яны звезлі з усяе Латвіі найбольш тыповыя сялянскія пабудовы і паставілі іх за горадам, у лесе, на беразе сіняга возера. Стаяць у лесе хаты, свірны, адрыны, вясковыя цэрквы, млыны, вянглярні, корчмы, і чалавек можа за дзесяць хвілін дайсці ад земгальскай сялібы да курземскай і паглядзець, як жылі продкі, а за некалькі гадзін даведацца пра ўвесь побыт старой Латвіі.

Даўно пара і нам, беларусам, зрабіць у сябе такое.

Мы з Геронімам, як і ў жыцці, не пайшлі ў царкву, затое старанна агледзелі карчму і пашкадавалі, што гэта толькі музей. Але справа не ў нашых схільнасцях, а ў другім. Была позняя восень, і музей зачынялі да вясны. Але нам паказаў усё вартаўнік, мудры стары латыш, чыста паголены, маршчыністы і, як многія жыхары поўначы, падобны на старую бабулю. Такія былі стырнавымі ў вікінгаў.

Але цяпер зусім іншы час, таму на старым быў брызентавы балахон, пад ім безрукаўка-кацавейка, а на нагах валёнкі, падшытыя знізу рабрыстай гумай з аўтамабільнай шыны.

Стары каменціраваў усё, што мы бачылі, цікава і даволі з'едліва.

Мы зайшлі ў відземскую хату. Тут я ўбачыў дзіўную печ, што нагадвае звон, а пад ёю — ачаг і зэдлікі. Сядзі сабе ў зімнюю халодную ноч, як у цагляным пакоі, і прадзі або вяжы сеткі: цёпла, светла (я асабіста дык і не вылазіў бы, так і спаў бы тут). На дварэ завіруха, а тут скача агонь, тут казкі, тут жыццёвая мудрасць старых і жарты моладзі. Хораша!

І вось калі мы выйшлі ў бакоўку гэтай цудоўнай, старажытнай

(яна мае не менш як дзвесце год) хаты, стары паказаў нам гравіраваны партрэцік чалавека ў лаўровым вянку.

— Сляпы Індрыкіс, — сказаў нам вартаўнік, — быў калісьці такі паэт… І вось, бачыце, вісіць на сцяне ў сялянскай хаце. Вы відушчыя — ці заслужылі вы такі гонар?

Я не скажу вам, хто з нас спаслаўся на нашу маладосць. І тады стары ўсміхнуўся:

— Ну, а са старэйшых вашых сяброў многія заслужылі?

— Чакайце, — неяк трохі самаўпэўнена сказаў я, — вось памром… можа, тады ўжо.

— Канечне, — суцешыў нас добры стары. — Толькі Індрыкіс, каб ён не быў сляпы, мог бы сам убачыць гэты партрэт у сялянскай хаце.

І, памаўчаўшы, спытаў:

— Што ж, можа, людзі горш пачалі пісаць?

— Не, — упершыню сур'ёзна сказаў я. — Лепш.

— Вось бачыце, значыць, лепш, ды не ўсе… Часамі каторыя былі паадвыкалі ад святой шчырасці кожнага слова… Што ж, хлопцы, ідзіце далей самі. Ногі ў мяне дрэнна ходзяць… А малады — бегаў…

Гэтая сустрэча была, бадай, самая цікавая за апошнія гады. Таму я і расказаў вам пра яе.

Мне робіцца лягчэй на сэрцы, калі бачу, колькі харошых хлопцаў (з той самай святой шчырасцю радка, аб якой казаў стары) з'явілася за апошні час. Моцныя повязі сплятаюць гэтых людзей, у якой бы краіне яны ні жылі. Братэрства нацый, братэрства шчырасці, братэрства паэзіі. І вось ужо на твары зямным алмазная сетка — ад сэрца да сэрца. Гэта толькі тыя, каго я ведаю: Знаменскі, Нішніянідзе, Астаф'еў, Барыскоў, Іяселіяні, сотні-сотні другіх. І колькі іх на Беларусі, і колькі ўсюды! Праз рэкі, моры, акіяны — тысячы моцных повязяў, братэрства сэрцаў.

Я рады, што і Латвія падарыла мне некалькі яшчэ нядаўна нечаканых, а цяпер неабходных сяброў. Не кажучы ўжо аб Героніме.

Гэта ўсе сапраўды добрыя хлопцы. Гэта Ояр Вацыеціс (Вацыеціс азначае "немец", хоць ніякі ён не немец, а латыш), гэта Арвід Скалбе (не той Скалбе, што пісаў казкі для дарослых, а той, што піша казкі для маленькіх), Яніс Лусіс (невядома, калі ён смялейшы: тады, калі водзіць яхту, ці тады, калі ўзнімае праблемы).

Рэдка калі я сустракаў такіх чыстых, такіх адданых справе паэзіі людзей (я маю на ўвазе не толькі вершы). І што самае дзіўнае ў латышскім характары — чысціня ў ім не мяжуе з тым ідыёцка-сумным ідэалізмам, ад якога кожнага нармальнага

чалавека нудзіць.

"Нудны, як усе людзі занадта ўзвышаных ідэалаў", гэты афарызм, мусіць, не датычыць маладога чалавека Янтарнай краіны. А маладога паэта — тым больш. Яны ўсе жывыя, вельмі жывыя, і нават іхнія слабасці мілыя мне.

Геронім пазнаёміў мяне з маладым шведам, кашчавым, гарбаносым і з нейкімі дзіўнымі манерамі. Швед сяк-так гаварыў па-руску, і мы трохі разумелі адзін аднаго. Швед быў цікавы. Ён так параўноўваў норавы і звычаі Швецыі і СССР, што можна было кончыцца ад смеху. Я прыліп да яго. А латышскія сябры сядзелі вакол, пакурвалі і маўчалі. Маўчалі, як кітайскія багі, як фіны, як лапландскія алені. Толькі часам нехта сур'ёзна пускаў дым і казаў:

— Так… То ж бо яно… Але…

Толькі вечарам выявілася, што швед ніколі не бачыў Швецыі і не ведае па-шведску ніводнага слова, бо завуць яго Арвід Скалбе. Беднага, даверлівага беларуса зноў падманулі.

І рагаталі з мяне, а я шкадаваў, што мой прадзед не эмігрыраваў у Парагвай і асудзіў нашчадка на ганьбу і сорам. Потым я ўзяў рэванш, ахарактарызаваўшы вычварна-бяздарны, ганебна-эклектычны дом Савы Мамантава як шэдэўр маскоўскай архітэктуры пятнаццатага стагоддзя і неўміручы помнік геніяльнаму дойліду. Яны паверылі.

Так што мы квіты, і я зноў люблю латышоў.

Мая табе парада, чытач: калі хочаш быць шчаслівы — бяры ў сябры латыша, а ў жонкі — латышку. Латышскія мужчыны — гэта верныя вочы і верны меч, гэта розум і крыштальная чысціня. А латышскія жанчыны — гэта янтарная казка, гэта прыгажосць і верная, вечная любоў. Нейкі зласловец сказаў, што жанчыны могуць зрабіць з нічога тры рэчы: капялюшык, салату і скандал. Дык вось трэці інгрэдыент гэтай злоснай прыказкі начыста адсутнічае ў латышскіх жанчын. Яны для гэтага занадта задумныя, жаноцкія і лірычныя. Гэта не лясны пажар — гэта цёплы добры агонь, да якога заўсёды будзе імкнуцца тваё сэрца. Толькі да яго аднаго. А якія імёны: Лайма (шчасце), Мілда (мілая)!

А латышскія дзеці! Дзеці ўсюды прыгожыя, але такіх прыгожых дзяцей, як там, мне, бадай, і не даводзілася бачыць. Латышы любяць дзяцей — першая прыкмета добрага чалавека! — і дзеці заўсёды прыбраныя, дагледжаныя. Яны адчуваюць, што яны — скарб. І таму дзеці тут мала плачуць і глядзяць на свет з аптымістычным спакоем васількова-зменлівывымі, як бурштын у вадзе, вачыма.

Аднойчы мы надумалі паехаць у Відрыджы, у добрую Відземе,

зямлю ідылічных хутароў, якая нарадзіла зусім не ідылічнага пісьменніка-рэвалюцыянера Леана Паэгле. З гэтай прычыны я раненька прыйшоў у былы рыжскі замак, дзе працуе мой сябар.

Замак гэты — вялізны квадратны будынак з унутраным дваром. Калісьці тут грукалі падковамі па каменні рыцарскія коні, луналі харугвы і п'яныя воклічы. Тады тут шмат гаварылі пра бога і з бухгалтарскай дакладнасцю падлічвалі, колькі латаў трэба адправіць на той свет, каб астатнія паверылі ў літасць Хрыста і яго слуг і ў тое, што гэтыя слугі нічога не робяць без маральна і юрыдычна абгрунтаванай прычыны.

Цяпер тут Палац піянераў і Літаратурны музей імя Райніса.

Дзіўна, але ніякая гістарычная з'ява не знікае, не пакінуўшы слядоў і моцнага, часцей за ўсё жыццяздольнага, насення. Вы можаце знішчаць народ, прышчапляць яму чужыя вераванні і чужую мову, і ўсё ж насенне, наканавана і ўпарта, дасць свой парастак, ды яшчэ часам і на вашым трупе.

Ці думалі божыя служкі, перакладаючы на латышскую мову казані і ўрыўкі з Евангелля, што самі капаюць для сябе яму? Не, яны толькі хацелі, каб прыгнечаныя латышы разумелі слова крыжа, каб яны сталі паслухмянымі рабамі. Дзеля гэтага яны складалі першыя латышскія слоўнікі і вывучалі латышскія язычаскія паданні. Відаць, яны дрэнна верылі ў догмат наканавання божага. І, мусіць, ужо зусім не ведалі пра вынікі сваёй набожнай справы, бо зарэкліся б яе рабіць.

Бо, самі не ведаючы гэтага, яны паклалі першы камень у падмурак латышскай літаратуры. Бо, самі не ведаючы гэтага, яны зачалі ў сваім чэраве дзіця, якое забіла іх.

І вось, як нейкі сімвал, у даўнім гняздзе цемрашальства і прыгнёту цяпер літаратурны музей, музей той літаратуры, якая жывіць не толькі Латвію, але і ўвесь культурны свет.

Нефы старой замкавай царквы былі для музея занадта няўтульныя. Іх падзялілі на тры паверхі. Кабінет майго сябра на верхнім паверсе, пад самымі гатычнымі скляпеннямі. А сам Геронім сядзіць у высокім крэсле, вывучае новыя дакументы пра фальклярыста Крыш'яна Барона і сустракае мяне шчырай усмешкай:

— Едзем!!!

Я нідзе не бачыў гэтакіх дарог, як у Латвіі. Латышы назнарок падганяюць сваю прыроду пад маляваныя кілімы. Такія прыгожыя замкі, такія затокі, зарослыя лілеямі, такія дэкаратыўныя купы дрэў! Не хапае толькі лебедзяў і дзяўчыны, што купалася б разам з імі. Зрэшты, лебедзі ёсць — у Рыжскім канале, а дзяўчаты, вядома, выбіраюць месца для купання трошкі далей ад дарогі…

У аўтобусе, у якім я ехаў, былі бадай што адны супрацоўнікі

літаратурнага музея. Першы прыпынак зрабілі ля так званай "трыццаць восьмай паралелі" (кветкі нявіннага латышскага гумару, бо "трыццаць восьмая паралель" — гэта буфет на трыццаць восьмым кіламетры ад Рыгі), дзе мы накуплялі бутэрбродаў і яшчэ сяго-таго. Гэты легкаважны рэмаркізм прывёў да таго, што пасля "трыццаць восьмай" усім у аўтобусе хацелася абдымаць шырокі свет і складаць вершы ў гонар жанчын. Усе латышы пішуць вершы, гэта іх нацыянальная хвароба, і ў гэтым сэнсе яны падобныя да беларусаў.

Латышы наогул менш адрозніваюцца ад беларусаў, чым прынята думаць. Ды і гэтая розніца такая нязначная, што яе лёгка ліквідаваць. Яны неяк хутка спасцігаюць таямніцы славянскай душы, і ў іхнім характары ёсць лёгкі налёт дастаеўшчыны, як у славяніна.

Аднаму латышскаму сябру я пераказаў некалі апавяданне Ляскова "Чартагон". Вы, вядома, памятаеце гэты твор. Там апісваецца папойка ў "Яры", папойка з цыганамі і біццём люстраў.

— Усё гэта вельмі добра, — сказаў сябар і, задумаўшыся, дадаў: — Але нашто люстры біць? Вось гэтага я ніяк не разумею.

Увесь гэты дзень я заўважаў, што мой сябар нечым заклапочаны. А потым ён раптам зарагатаў:

— А здорава! Дальбог, здорава! Напэўна, гэта і сапраўды добра — біць люстры.

Я ніколі не біў люстраў. Ён, як цывілізаваны чалавек, напэўна, таксама не будзе іх біць, але ж думка — гэта той жа самы ўчынак, і таму мне давядзецца на страшным судзе адказваць і за гэты грэх.

Развіў, называецца, свядомасць сябра…

…Наваколле Відрыджы ўсё блакітнае ад вод, ручаін і ціхіх азёр. Тут жыве харошы народ, мудры і працавіты, як сама Відземская зямля. Жыццё гэтых людзей ідзе ў змене дня і ночы, лета і зімы, працы і адпачынку — і ў гэтым, відаць, і ёсць найвышэйшая мудрасць: есці хлеб з поля, якое ты сам урабіў.

Удзячная, добрая зямля можа заваліць маслам і малаком паўсвету.

Добрая парода жывёлы, сытыя цяляты на адпоі, такія кругленькія і чысценькія, што хоць давай залаты медаль.

Здавалася б, чаго яшчэ?

Як чаго? А дурні, якіх, як вядома, не сеюць і не жнуць? І гэтыя дурні ходзяць у разумных не толькі ў Латвіі, але яшчэ і ў маім Прыдняпроўі, і на Разаншчыне, і шмат у якіх мясцінах.

Ёсць правільная пастанова: зааараць лугі з марнай і дзікай травою, выбітыя і здратаваныя жывёлай. Супраць гэтага не будзе пратэставаць ніводзін добры гаспадар.

Але хто, скажыце, даў загад заворваць лепшыя лугі, дзе косяць духмянае, як чай, сена? Ніхто. І, аднак, гэта робіцца праз нядбайных гаспадароў. Нядаўна я быў на Разаншчыне. Там, у наваколлі Салотчы і ясенінскага сяла Канстанцінава, начыста зааралі лепшыя ў Саюзе салотчынскія паплавы, сена з якіх калісь ішло на арлоўскія і пецярбургскія конныя заводы. Як гэта назваць, як не нядбайствам?

Тое ж робяць і ў некаторых другіх мясцінах.

О, каб можна было вымачыць дурняў і засеяць зямлю разумным насеннем! Але дурні, на жаль, вільгацеўстойлівыя і родзяць, як мак-самасейка. І ўсё ж, як ні цяжка, дзяржава павінна зрабіць гэта, бо справа, урэшце, ідзе аб шчасці працаўніка, які сваімі рукамі стварыў усё, што ні ёсць на гэтай зямлі.

Людзі варты шчасця, дзе б яны ні жылі: на Ацэ, у Прыдняпроўі, ці па берагах сініх латышскіх азёраў, або ў наваколлі Відрыджы.

А людзі ў наваколлі Відрыджы, як і ўсюды, добрыя.

Ці памятаеце вы, Ганна Лестландэ, двух бадзяг, што проста так зайшлі ў вашу хату? Вы паілі нас малаком, не пытаючы, хто мы і што мы, не ведаючы нічога пра нас. Вашы натруджаныя рукі былі цёмныя і шорсткія на далонях, як торф, ледзь цямней за таго цяжкага пульхнага хлеба, які вы кроілі для нас.

Ваш дом з устойлівымі, адвечнымі рэчамі, такімі звыклымі, што аб кожнай можна было б расказаць гісторыю, быў нашым мірным прытулкам толькі на адну гадзіну. Я хачу аддзячыць вам за ўсё, добрая пажылая жанчына. І я не ведаю, як зрабіць гэта. Хіба расказаць пра вас у казцы, з якой вы калісь выйшлі на зямлю.

Або вы, Бірута Бетхерэ, малады і такі прыгожы брыгадзір, царыца відрыджскіх ніў, з глыбокімі, як неба, вачыма, такая непарушна-спакойная на выгляд, што нельга было паверыць у ваш подзвіг, калі — толькі за дзень да нашай сустрэчы — запалаў ад удару маланкі цялятнік. Мы хадзілі з вамі па палях, чулі вясёлы перастук з кузні, бачылі за жывымі агароджамі сытых кароў, пра кожную з якіх вы ведалі ўсё. Гэтыя каровы былі такія паважныя, што чалавек адразу разумеў, чаму ў старажытным Егіпце абагаўлялі карову Хатор і яе багароўнага мужа быка Апіса.

Аставайцеся шчаслівыя, Бірута Бетхерэ і Ганна Лестландэ!

…Дарэчы, я дрэнна аддзячыў за гасціннасць. Даслаў свае кнігі. Такога ўдару яны, вядома, не чакалі.

Вось чаму я хачу хоць трошкі акупіць свой грэх. Пішу —

…Відземскую казку

Ці-лі-ліа-цірр… Што азначае: лётаў жаўранак у паднябессі… Не які-небудзь там безгалосы саліст, не па заслугах увянчаны званнем, а сапраўдны, звонкі відземскі жаўранак, што прыляцеў сюды яшчэ ў марозную ноч, змёрз, згаладнеў, а раніцай паляцеў і аддзюбнуў ад сонца кавалачак, каб закапаць яго ў закалелыя скібы відземскай краіны.

І вось лётае і спявае, бо заслужыў у сваёй зямлі права на палёт і на спеў.

Ён дрыжыць нясцерпна-высока, гэты жаўранак. А пад ім, у сіняй глыбіні стаўка, трапеча яго двайнік.

І мы ідзём па беразе якраз паміж двума жаўранкамі. І ўвесь свет спявае вялізным жаўранкам, радасны і празрысты, як ён.

Дарога вядзе ад хутара да хутара, мяккая, як аксаміт, расквечаная блакітнымі лужынкамі, звілістая і няпэўная, як палёт матыля.

Яна віецца ля рэчак і маленькіх гаёў, перавальвае цераз былыя ледавіковыя грывы, нырае ў крывавыя канюшыннікі.

Дыхайце, грудзі, спявайце, вусны, спяшайцеся ў дарогу, ногі!

І няхай трапеча над галавою жаўранак, няхай ляціць у твар вецер з не ходжаных яшчэ палёў.

Дай руку, друг! Чуеш, певень заве нас! І ва ўсім свеце мы адны. Толькі мы і жаўранак у далёкай вышыні… Вось сіняе вока возера, вось ліпы над ім.

Над возерам рута на луках,
І ліпы, і чмель на ляту.
Сваю невялікую муку
Ўсю зможаш ты выплакадь тут.

Нашто мне выплакваць муку, дружа? У мяне ж няма яе, праўда? Адкуль бы ёй быць? Проста мы разам ідзём з табою ў краіну казкі, і на яе межах сустракаюць нас мудрыя калматыя сабакі. Такія белыя, як быццам гэта малюсенькія кавалачкі воблака ўпалі на зямлю.

— Ці добрыя вы людзі? — пытаюць у нас яны. — Ці наступалі вы сабакам на лапы, ці бралі іх з сабою на рэчку, ці дзяліліся з імі апошнім кавалкам?

— Так, мы добрыя, — кажам мы.

— Тады ідзіце налева ад вялікай дарогі, - кажуць сабакі. —

Там чароўныя маленькія хутары, там квітнеюць сады, там жыве Ганна. Там і казка, якую вы шукаеце.

Мы ідзём туды, дзе — далёка-далёка — узносяцца раскошныя шаты дрэў.

…Імкне ручаінамі празрыстая вада, калыша ў сабе срэбнае цельца маленькай вясёлай міроны. І, каб міроне было добра жыць, цягнуцца з неба да ручаін і палёў празрыста-дымныя фіранкі далёкіх дажджоў.

Стань ціха! Чуеш? Гэта мірона кажа журліва-салодкім, нячутным галаском:

— Дзякуй вам, добрыя дажджы! Дзякуй табе, дарагая зямля! Дзякуй і вам, добрыя людзі, за тое, што ідзяце берагамі і не хочаце злавіць мяне!

Хутары высокія, з шэрага і ружовага каменю, які ляжыць у мурах такімі прыгожымі няроўнымі брыламі. Брылы гэтыя знадворку роўна і гладка адпаліраваны. А да вялікіх дамоў квадратамі прымыкаюць дворныя будынкі.

Канавы, пазарастаныя густой травой, струменяць кудысьці ясную, добрую ваду. Над імі непралазным гушчаром растуць вялізныя, як коўдра, лопухі. Пад іх навіссю цырымонна вітаюцца агністы Шантэклер-певень і мініяцюрная Юнгфрау — вадзяная курачка.

— Як сп-р-равы, о мая цудоўная, мая ясная, мая невер-рагодная, мая маладая каралева к-канаў?

— Вы ўсё жартуеце з беднай пасялянкі, месьё, — апускае яна вочы. — А справы нічога… Рэвень урадзіў такі густы — хаваешся з галавой.

Певень скоса паглядае на свой адбітак у вадзе. І раптам заўважае нас.

— Кур? Кур? — пытае ён па-латышску. — Куд-куды ідуць гэтыя цыбатыя?

— Кракс, — гэта качка вядзе ў лапуховыя нетры сваю пушыстую флатылію. — Кракс. Гэта два паэты, Паэты сярод людзей — усё адно што індыкі сярод птушак… Шабалды-балды-балды… І так усё жыццё… Смехата! Гэта яны ідуць да добрай Ганны, што не шкадуе мне слімакоў.

І качка заплывае недзе пад бераг. Толькі вялікія лопухі варушацца над ёю.

— Перагарае, як у качкі, - здзекліва кажа Шантэклер. — Глытае гэтых слімакоў разам з панцырам.

Але качка не чуе. Яна далёка. І стаяць, не варухнуцца над канавай вялізныя, як коўдра, лопухі. Дзе ты, дом добрай Ганны? Ага, напэўна, вунь там, дзе квітнеюць дрэвы ля агароджы, дзе вада з канавы разлілася маленькім азярком. Над азярком пунька

— зусім як у музеі пад Рыгай, і жорны пакладзены замест прыступкі пад яе дзвярыма. А над азярком, над коўдрамі лопухаў стаіць на дрэве бусел.

— Ганна! Ганна! Ідуць два цыбатыя. Ідуць два бясперыя. Хутчэй кажы хохлікам-гномам, каб канчалі рыхліць грады пад бабы.

Ах, бусел, бусел, што ж ты нарабіў! Як жа нам цяпер паглядзець казку?!

А вось і яна. Ганна выходзіць нам насустрач і запрашае ў дом.

— Піенс, — кажа яна, і я разумею: малако.

— Майзе, — кажа яна, і я разумею: хлеб.

Будзьце блаславёныя, малако і хлеб Відземе! Будзьце блаславёныя, добрыя зморшчынкі гаспадыні.

Тут усё адвечнае і цяжкаватае. Вялізная дубовая шафа, у якой начамі сама па сабе пахрумствае чысцюткая, як снег, накрухмаленая бялізна. Пліта, пафарбаваная, як усюды ў Латвіі, у чырвоны колер. А на сценах доўгі і шырокі фрыз, на якім намаляваны высокія, у рост дзіцяці, казачна-бардовыя мухаморы.

Дзе ж яшчэ жыць казкам, як не тут? Тут, дзе ўсе рэчы дзесяцігоддзямі стаяць на сваім месцы. Тут, дзе нават святло прабіваецца ў пакой праз выразаныя сэрцайкі ў аканіцах. Тут, дзе бабуля, бабульчына маці і яе бабка — усе сядзелі на тым жа крэсле і ставілі ногі на той жа зэдлічак.

А дзеткі-малалеткі, гуляючы ў хованкі, часам, як у самае надзейнае месца, хаваліся пад шырокую — у восем пол — клятчастую бабуліну сукенку.

Казка надзейна затаілася ў гэтым доме. Гэта добры дамавік звівае з гарохавіння мяккі цяўнік пад нагамі ў кароў. Гэта добрая жонка Бая пахрумствае ўначы бялізнай, пераглядаючы яе.

І гэта хохлікі сядзяць ноччу ў цёплым попеле ля пліты, гуляючы ў карты чалавечымі снамі.

— Што ты мне торкаеш гэты сон? Хіба гэта бітка? Клопат адзін: гаспадар сніць пра капу канюшыны, што забыўся ў полі… Пхе!

— Замірыў, ды пад цябе чырвовага туза… Гэта Ганна сніць пра ўнукаў… Ну, чым будзеш біць? З'еў? Прыпёр я цябе? Гуляць трэба ўмець, маладыя людзі. Але "прыпёрты да сцяны" самы малады хохлік усміхаецца:

- І паб'ю. Казырным званковым. Сном малодшай дачкі. Сёння суседскі сын… Як бо яго?.. Здаецца, Гунар… Дык вось, сёння ён сказаў ёй нешта пад буслянкай…

Дай бог, каб споўніліся вашы харошыя сны, добрая Ганна!

Мы выходзім з хаты і зноў ідзём у вільготныя палі. Згасае над срэбным лугам далёкая вясёлка. Вялізныя, як коўдра, лопухі

варушацца над канавамі.

Вакол казка. Вакол спакой і мір, і твая рука на маім плячы, дружа. Але, відаць, дарэмна я ўцякаў у казку і спакой, бо трывога расце ў маёй душы.

Чаму? Можа, таму, што тут, зусім непадалёку, латышскія, як на карцінах Разенталя, ціхія могілкі, апетыя Паэгле, тыя, дзе калісь стралялі ў народ і дзе кроў тры дні, не засыхаючы, стаяла на камянях?

Не, не таму. Не таму штосьці бурнае імкне з мае душы. Але чаму, чаму я не знайшоў міру нават тут, чаму звініць трава на паплавах? Чаму дыхае такім сумам туга палёў?

— Дружа мой, дружа! Што ж мне рабіць? Што мне рабіць, калі я кахаю яе?!

Мора, супакой нашы душы! Даволі зялёных дарог, закалышы наш смутак блакітнымі дарогамі, на якіх не астаецца слядоў.

Сёння мы пойдзем з рыбакамі ў твае далечы і вырвем у цябе адказ. Досыць з нас ідылій! Досыць буслаў над хатамі і казак! І на гэты раз ты не падманеш свайго пакорнага слугу, не пасмяешся з яго недасведчанасці, як тады — памятаеш? — калі ён знайшоў на беразе празрысты вясёлкавы шар і ў дзіцячым захапленні крычаў на ўвесь свет, думаючы, што гэта сігнал няшчасця часоў князя Вячка або мяч, якім гуляюць на хвалях спакуслівыя дочкі Нептуна, блакітнакосыя Нераіды.

Ах, як ты падманула тады жаўтадзюбага вершаплёта, мора! І як гэта ты магло падкінуць яму замест мяча шкляны паплавок рыбацкага нерата?

…Да саракавога года рыбакі жылі горш за ўсіх у Латвіі. Цяпер рыбакі жывуць, бадай, лепей за ўсіх, і пра іх столькі ўжо гаварылі ў друку, што следам за Жанам Лабруерам я пераканаўся: усё ўжо сказана, і не варта псаваць паперу.

Ужо гаварылі пра чысцюткія фіранкі, пра тэлевізары ў кожнай хаце, пра надзейныя матаботы, пра тралы, якімі ловяць рыбу ў паўднёвай частцы Янтарнага мора, дзе роўнае дно, і пра нераты, якімі ловяць у паўночнай частцы, дзе архангелы варылі суп, ужываючы замест фрыкадэлек такі маласпажыўны матэрыял, як скалы і валуны, і вымасцілі імі дно.

…Такія ўжо нашы журналісты. Няма на іх упыну.

Іхняе начальства, відаць, цвёрда пераканана, што журналісты дзейсна памагаюць там, дзе прарыў, дзе гарачая пара. І вось сотні дзядзькоў з фотаапаратамі блытаюцца ў нагах людзей, якія працуюць, і бадзёра кідаюцца туды, дзе і без іх шмат лайдакоў, ледзь толькі пачуюць аптымістычны прызыў: "Журналістаў — на палі! Журналістаў — у мора!"

Э-э, гэта я ўжо нешта не тое сказаў. У мора іх нельга, ні ў

прамым, ні ў пераносным сэнсе. У прамым — бесчалавечна, і наогул шкада. А ў пераносным нельга таму, што бедны Нептун атрымае такую даніну, што яму давядзецца ўцякаць у самыя глыбіні Атлантыкі.

Балтыка не глыбей за сотню метраў. Тут не схаваешся.

І вось я гляджу на бераг са зламанымі соснамі, на хвалі, што павольна бягуць на яго, на неба з рэдкімі аблокамі.

Мора! Вецер перапаўняе цябе, і вочы, каб не слязіцца, самі прымаюць той прыжмур, які ўласцівы какеткам і прасоленым "марскім ваўкам".

І цяпер я разумею, чаму грэчаскія гапліты, прыйшоўшы з пяскоў Азіі да марскіх хваль, падалі на калені і цалавалі пясок, разумеючы, што яны ўратаваны.

Таласа! О Таласа!

Бо гэта ж тут я на спадзе дня ўбачыў у хвалях марскую царэўну. Тую самую, што калісьці задыхалася ў бочцы з зялёнай вадою. Тую, якую вызваліў і выпусціў у мора прыслужнік пры балагане, хлопец, што пайшоў у Рыгу ў заробкі.

Я сказаў пра гэта Героніму. Але той быў у празаічным настроі, і таму азваўся змрочна:

— Не быў бы ты пісьменнікам, каб не ўмеў маніць.

Я засмуткаваў быў, але потым змірыўся.

І ўсё ж неспакой жыў у маёй душы, а разам з ім вырастала трэцяя янтарная казка.

…Казка пра янтарны палац

Шшш… усхліп… усхліп… шшш… Што азначае: "Набягала мора на янтарны бераг, які тады яшчэ не быў янтарны…" Хвалі паміралі на пяску, пакідаючы пасля сябе хлапякі пены…Шшш… шшш… шшш… А на беразе, між зламанымі соснамі, стаяла хата. Жыў у той хаце малады і гожы рыбак з янтарнымі валасамі…

Я не ведаю яго імя, і не ведаюць другія людзі — надта ўжо даўно, вельмі-вельмі даўно гэта было. Да рымлян, да егіпцян… Адкуль я ведаю гэта? Вельмі проста: рымляне насілі янтарныя бранзалеты, егіпцяне рабілі з янтару вочы для сваіх мумій. А янтару яшчэ не было ў той час, калі жыў наш рыбак, — дык, значыць, гэта было раней.

Але ўжо тады на берагах Юры жылі латы: вось якое гэта даўняе племя. Нездарма ж нейкі вучоны гаварыў з жыхарамі глухіх латышскіх і літоўскіх вёсак на старажытным індыйскім санскрыце і ледзь не звар'яцеў, адкрыўшы, што сяляне яго разумеюць.

Але наш рыбак анічога, вядома, не ведаў пра гэта і не ганарыўся. Ён ведаў толькі сонца, што ўставала з зямлі і сядала ў мора, толькі свае нераты і свае цудоўныя песні, бо ён быў бесклапотны і нежанаты.

Можа, таму і ўпадабала яго марская царэўна. А панаваў у той час над зямлёю бог грымотаў, дымна-чырвоны Пярун. Пабраўся ён з Зямлёй, і нарадзілася ў іх дачка, прыгажэй за якую не бачыла і ніколі не будзе бачыць сонца. Была яна як сонечны прамень, і як морская хваля, і як каханне, і як прыгажосць усіх жанчын, увасобленая ў адной. І, як гэта часта здараецца з прыгожымі, была яна зусім без сэрца.

Пярун любіў сваю дачку і аддаў ёй ва ўладу мора. А каб было ёй дзе жыць, збудаваў пад вадою з сонечнага святла самы гожы з усіх палацаў, якія толькі бачылі людзі і багі.

І вось адтуль, з гэтага палаца, яна і выплывала на хвалі. І дзівіліся з яе прыгажосці рыбакі, мужныя воіны, што плылі ў сваіх ладдзях рабаваць чужыя берагі, і гусляры, якія прыходзілі да мора па натхненне.

А на каго гляне яна — той робіцца слабы, як сітняг, і пакутуе, і нясе ёй найлепшыя песні і кроў сэрца, а потым, звар'яцеўшы, кідаецца ў хвалі, а яна бярэ яго да сябе ў палац і там, змучыўшы пагардаю, навек аддае ў абдымкі чорнай нечысці падводных глыбінь.

Так яна хацела зрабіць і з нашым рыбаком, але ён, хоць і

вельмі закахаўся ў яе, не кінуўся ў глыбіні. Ён быў узвейвецер.

Яна не раз клікала яго да сябе, але ён адказваў толькі песнямі.

Гані каханне — яно пабяжыць за табой.

Царэўна сама не заўважыла, як знікла яе злосць на гэтага непакорнага хлопца. Кожны вечар яна гайдалася на хвалях і слухала песні, і, урэшце, слёзы пачалі падаць з яе вачэй.

Тады яна не ўтрывала і сама выйшла на бераг, апусцілася на калені перад рыбаком:

— Вось я перад табою. Але ці кахаеш ты мяне?

А ён стаў на калені і ўзняў яе, бо цяпер, калі яна сама кінула дзеля яго мора, ён стаў яе рабом.

Песня змоўкла. І над морам стала цішыня…

…Цяпер часта, кожны вечар, яны сустракаліся на скале, што абрывалася над морам. Яна прыходзіла са свайго палаца, ён — са сваёй хаты, і яны доўга сядзелі разам на сухіх водарасцях, і ён цалаваў яе косы, яшчэ вільготныя і трошкі салоныя ад хваль, з якіх яна выйшла. Вочы яе цяпер былі добрыя, як мора ў штыль, і ён спяваў песню пра гэтыя вочы, і нават сонца спынялася, слухаючы яе.

Стаміўшыся, яны елі рыбу, разрываючы яе рукамі. Часам палавіна рыбы падала ў хвалі (калі іхнія вусны былі заняты іншым) і, ажываючы ў роднай стыхіі, плыла ў мора пад вясёлы лямант чаек.

Так з'явілася ў моры камбала.

Яны кахаліся доўга і аддана. Але вось дымна-чырвоны Пярун даведаўся пра ўсё. У гневе на дачку і на род людскі ён, дачакаўшыся, калі дачка зноў пачне збірацца на спатканне, кінуў у мора небывала-магутную грамавую стралу. І тая прабіла паветра і мора і ў дробныя кавалкі разбіла сонечны падводны палац, забіўшы дачку. Забіла ў імгненне вышэйшага шчасця, бо Пярун шкадаваў дачку.

Мора рынула на бераг, выносячы на пясок сонечныя асколкі палаца, і рыбак зразумеў, што здарылася бяда, і кінуўся ў хвалі — ратаваць. А там яго схапіла варта, закавала ў кайданы і намёртва прывязала да адзінай калоны, што дзівам асталася цэлая. Да адзінай калоны былога палаца.

Мірыяды асколкаў на дне. Ляжыць на іх жанчына. А непадалёк ад яе стаіць сонечная калона, да якой прыкуты юнак. Схіліў галаву, заплюшчыў вочы. Ён цяжка дрэмле, але часам паднімае павекі…

…Вось яна перад ім. Тут. Побач. І, здаецца, жывая. Здаецца, трапечуцца яе вейкі. Ледзь прыкметна. Ці гэта сонца трапечацца на іх?

Гнеў загараецца ў яго вачах, і ён пачынае ўтрапёна і безнадзейна рвацца да яе.

І тады на моры ўзнімаецца бура. Маланкі б'юць у высокія, амаль да неба, хвалі, і караблі стаюць не мацнейшыя за яечную шкарлупіну. Бізунамі б'юць канаты, і ветразі чайкамі ляцяць у чорны змрок, а людзі ў адчаі ўзнімаюць рукі.

Тады юнак бачыць цені маракоў, што апускаюцца на дно, і сціхае.

Яму шкада людзей. І што, што зменіш, прыціснуўшы да сэрца мёртвую?

Не вернеш! Не вернеш!

А мора, супакойваючыся, нясе і нясе на бераг кавалачкі сонечнага святла, асколкі палаца — янтар.

Што ж зробіш, дружа. Сапраўднае заўсёды канчаецца мукамі. У гэтым ёсць нейкая горкая мудрасць. І яна дае нам мужнасць жыць.

Дзякуй табе, мора. Пойдзем зараз туды, дзе святлом канчаецца простае шчасце, дзе нараджаюць яснавокіх дзяцей. Пакаленне за пакаленнем, пакаленне за пакаленнем. І зноў у чаргаванні іх народзіцца няпростая пакута з яе мужнасцю і подзвігамі. Гэта абавязкова было, ёсць або яшчэ будзе. У кожным доме. У кожнай простай дынастыі. Дзеля гэтага жывём.

Паедзем зараз да іх. Гэта ж цябе запрасілі ў наваколле Ляўдоны кумам на простыя хрэсьбіны. Забяры мяне з сабою. Ага, ты так і думаў! Што ж, дзякуй табе…

…У Крустпілсе, дзе трэба знайсці машыну аж да Ляўдоны, кідаем на волю лёсу цягнік. Бедныя людзі! Яны не едуць на хрэсьбіны ў Ляўдону. Ад усяе душы шкада іх. Так ім і галець без хрэсьбін у Ляўдоне.

Крустпілс азначае — Замак крыжа. Крыжа я не бачыў. Замка таксама. Бачыў толькі аўтобусны вакзал, таму што мы ўпарта і гераічна чакалі таксі аж тры гадзіны. Толькі тут я зразумеў сэнс старога латышскага анекдота, і паколькі ён пашырыць нашы веды пра латышскі нацыянальны характар, перакажу яго вам.

Пасажыр едзе цягніком Даўгаўпілс — Крустпілс — Рыга. Ён трохі падвыпіў і просіць правадніка-латыша, каб той разбудзіў яго ў Крустпілсе.

— Бачыце, які я? Гулялі два дні, магу праспаць. Дык вы ўжо, калі ласка, разбудзіце.

— Я, — кажа праваднік. — Лабі. (Так… Добра.)

— Я сплю моцна. Магу ў сне лаяцца, можа, нават адбівацца, дык вы ўжо, будзьце ласкавенькі, калі трэба — і сілаю не бойцеся будзіць.

— Я… Зробім…

— Вось мой чамадан, дык вы і яго…

— Я… Абслужым.

Пасажыр кладзецца спаць і… прачынаецца ў Рызе. У адчаі пачынае лаяць правадніка. Праваднік маўчыць. Абураныя пасажыры спачуваюць правадніку.

— Дробязь, — нарэшце не ўтрываў праваднік. — Хіба гэта лаянка? Чулі б вы, як лаяўся і адбіваўся той пасажыр, якога я высадзіў у Круствпілсе… О-о…

Маючы на ўвазе гэты анекдот, я стараўся быць вытрыманы і спакойны, пакурваў і на гарачыя тырады Гераніма адказваў:

— О-о…

Відаць, я сваю ролю выконваў так добра, што нейкая дзяўчынка падышла да мяне і спытала пра нешта па-латышску.

— Я, — адказаў я. — Лабі.

Геронім усё растлумачыў за мяне, і мой прэстыж астаўся на вышыні. Я ганаруся тым, што мяне палічылі за латыша. І мне сапраўды ўдаецца быць латышом. Напрыклад, магу згуляць з латышскім дзіцянём у цікавую гульню, не ўжыўшы пры гэтым ніводнага беларускага слова, а толькі латышскія. Робіцца гэта так.

Дзіця выходзіць за дзверы, марудзіць там і потым стукане ў філёнгу.

— Кас тур нац? — трэба спытаць тады, і гэта азначае: "Хто там ідзе?"

— Гаў-гаў! — чуваць з-за дзвярэй.

— Кас тур нац? — гэта трэба спытаць ужо трывожна.

Дзверы адчыняюцца, выглядае мілы дзіцячы тварык, няхітра насуплены ад лютай злосці.

— Вілкс, — на цябе строга глядзяць сінія вочкі. Вы самі здагадаліся, што гэта азначае "воўк".

— Вілкс, вілкс! — у жаху крычыцё вы.

"Вілкс" набліжаецца, страшна заграбаючы лапкамі паветра. І тут ужо трэба падаць на канапу ці нават проста на падлогу і адчайна крычаць на чыстай латышскай мове:

— А-ай! А-а-а-й!

…Ф-фу-у! Вось нарэшце мы едзем у Ляўдону.

Ляўдона здалёк нагадвае цукатны торт, такая яна чысценькая і прывабная. Мураванкі, хутары. А вакол сады і лясы. Часам цукаты будынкаў быццам пашчыкалі дзіцячыя пальцы: стаіць у гушчары здзічэлых слiў каробка колішняга хутара ці, пустая ўсярэдзіне, ідылічна-дзікенсаўская цэркаўка. І толькі потым здагадваешся, што не дзіцячыя, ліпкія ад ласункаў, пальцы зрабілі гэта, а кашчавая рука вайны. Бо на гэтую блаславёную зямлю, на гэты ціхі гарадок падалі бомбы, і нехта меў нахабства страляць па ім з гармат.

Я чалавек сціплы і, пакуль не давёў адваротнага, мяркую, нават трошкі баязлівы. Мне не падабаюцца бомбы і вельмі падабаюцца тутэйшыя дамы. Яны мураваныя, з камення. Сцены знадворку ў іх адпаліраваны, як у метро. Сам дом двухпавярховы, з зялёным ад старасці чарапічным дахам, вокны невялікія — не дом, а цытадэль даброт, шчасця, няспыннай працы і дастатку. Упрытык да яго, часам пад адным дахам, дваровыя будынкі. І ўсё гэта ў вянку яблынь, ігруш, ліп.

Я ж вам кажу, я не помслівы і зусім не крыважэрны чалавек. Я не люблю кулявых шрамаў на такіх мурах. І ўсё ж мне хацелася б, каб сцены аднаго вось такога дома, у якім я буду жыць у апошнія свае гады, былі спаласаваны і знявечаны шрамамі і выбоінамі, бо я хацеў бы, каб усіх каралёў вайны, усіх, хто робіць барабаны, а не скрыпкі, прывялі ў адзін добры дзень да муроў майго дома і тут расстралялі ўсім наяўным запасам патронаў. Гэтыя залпы я слухаў бы як бахаўскія "Страсці", з тым прыемным хваляваннем, што памагае пісаць вялікія вершы.

…Дзень цудоўны, блакітны, як крыло сіваваронкі. Даўно ўжо з'ехаліся на хутары кумы, якіх запрашаюць на хрэсьбіны здалёк, часта аж з самае Рыгі. Гэта розныя людзі, сярод іх можна сустрэць і рабочага і пісьменніка. Кумы чысцяцца, прыхарошваюцца. Дзіця ўбіраюць у лялечны народны касцюмчык або ў пухавое "медзведзяня". Потым ідуць у сельсавет.

Так зрабілі і мы. Маці трохі затрымалася, і таму малога Айвара панеслі толькі мужчыны: кум Геронім, бацька, сусед і я. Пакуль тое, дзіця нясу я.

Дарога мяккая, паабапал яе глыбокія, аксамітна-зялёныя канавы, а далей сады ў квецені і раскошныя купы ліп.

Насустрач нам едзе фурманка. З воза пажылы фурман крычыць нешта. Усе рагочуць. Даведваюся, што нас як кумоў пасадзілі ў лужыну:

— Во, мужыкі хлапчынку нарадзілі. Раней дык з гэтым неяк бабы спраўляліся.

На ганку ў сельсавеце нас сустракаюць дзяўчаты ў народных уборах і праводзяць у пакой, дзе на стале ляжыць вялікая кніга ў ціснёнай вокладцы. На кожнай старонцы — фота дзіцяці. Тут жа напісана: "кум" і "кума". Кумы распісваюцца. Грае музыка. Поўна людзей з дзецьмі на руках. Дзеці ўсе у карунках, атласе, самаробных стракатых коўдрачках. Малыя сядзяць паважна, як маленькія шчаслівыя прынцы. Толькі часам нехта з іх салідна выкажа сваё абурэнне і пратэст. Але паколькі іх многа — уся далейшая цырымонія праходзіць пад акампанемент:

— А-а… О-о-о… Крэх-крэх.

Кумы нясуць дзяцей у другую залу. За імі ідуць астатнія.

Зала — як суцэльны грот з кветак. На спінках крэслаў гірлянды незабудак, у насценных вазах букеты нарцысаў і цюльпанаў. Столь — як кветкавы шацёр. І ля сцен — маладыя бярозкі.

А на сцэне — дзявочы хор. Ніжэй — вясковы аркестр.

Кумы з дзецьмі садзяцца парамі, ля праходу. І хор пачынае спяваць. Песні яго — тыя песні, што спявае народ пра дзяцінства, пра маці, пра будучы лёс немаўлятка. Музыка, водар кветак. Усе сядзяць трошкі расчуленыя.

Потым пачынаюць выклікаць на сцэну кумоў. Яны ідуць з малымі на руках. Адна пара… Першая…

Там, на сцэне, іх шэптам пытаюць, як яны хацелі б назваць дзіця (гэта, вядома, рытуал, бо некаторым дзецям амаль год, але так прыгажэй). І вось гучаць са сцэны пявучыя словы:

— Наракаю табе імя Гунар… Наракаю табе імя Айвар…

Кожнаму дзіцяці даюць каробку з пасагам, а кумам і бацькам па букету кветак. Пасаг розны, але харошы. У дадатак дзіцяці: падносяць прыгожы вялікі кубак для малака.

— Пі. Расці харошы.

Калі кумы ідуць са сцэны, услед ім адна з гожых дзяўчат кажа — кожнаму іншая — народныя выслоўі пра маці, пра тое, як трэба шанаваць дзецям бацькоў, а бацькам дзяцей. Потым хор спявае песню.

Кожны павінен памятаць гэты дзень як найлепшае свята, пра якое маці з захапленнем раскажа сыну, калі той пачне разумець, а сам ён, ужо старым дзедам, раскажа ўнукам, як яго "хрысцілі" ў гроце з кветак.

Падарункі для дзяцей купляе саўгас. І гэта абыходзіцца не вельмі дорага. Затое колькі святла і колькі ўспамінаў!

І гэта не толькі ў дзень хрэсьбін. Часта спаборнічаюць хоры суседніх вёсак, часта ставяць спектаклі. Напрыклад, у той самы дзень у Крустпілсе самадзейная трупа ставіла "Вей, ветрык" Райніса на беразе возера. Гледачы сядзелі проста на траве, а дэкарацыямі былі купы дрэў і вада.

Так маленькі народ будуе сваю вялікую культуру, так ён умее рабіць гожым кожны дзень свайго жыцця. І, паверце мне, ляўдонскія хрэсьбіны адвучаць людзей ад царквы хутчэй, чым нецікавая лекцыя пра рэакцыйную сутнасць хрышчэння.

І я падумаў: чаму ж мы не ўмеем спраўляць вось гэтакія хрэсьбіны, вось гэтакія святы?

А мы ж не горшыя. Няма бесталанных народаў. Няма народаў без цягі да прыгажосці. Кожная выцінанка на шыбе сялянскай хаты неабвержна сведчыць пра гэта.

А чалавеку патрэбна радасць. Ён жыве дзеля яе.

…Пасля хрэсьбін хор спяваў яшчэ, а потым кумоў з дзецьмі развезлі на саўгасных і асабістых машынах па хутарах. Астатнія пайшлі пехатою, бо паветра было ласкавае, а неба — празрыстае.

Потым гулялі дома. Былі музыка, спевы, танцы. І ўсе былі трошкі на падпітку, але за два дні я не бачыў ніводнага п'янага.

Чорт ведае які моцны народ жыве там! На хрэсьбінах я пазнаёміўся з тамтэйшым кавалём, якому даў пяцьдзесят — пяцьдзесят пяць год. На самай справе яму было восемдзесят, і ён грукаў молатам з пятнаццаці год, толькі летась кінуўшы працу, ды і то, бадай, таму, што саўгас пабудаваў новую майстэрню, а старэнькая кузня, дзе падкоўвалі коней ды рабілі нарогі, стала непатрэбная. Так яна і стаяла зачыненая — аж шкада было яе, як жывога чалавека.

Каваль гэты быў жывой рэліквіяй наваколля, бо кожны вечар пасля працы выпіваў бутэльку "крышталю", а яго біяграфія магла б паслужыць сюжэтам для рэнесанскага рамана. Слухаць, як ён падмайстрам абдурваў "шэрых баронаў", была чыстая асалода.

На гулянцы пасля хрэсьбін ён піў цёмнага латышскага піва больш за ўсіх і быў самы цвярозы.

А пілі ўсе, бо гаспадар і гаспадыня ўмелі так ласкава прымусіць, што адмовіцца было нельга. Дый наогул, за сталом панавала атмасфера шчырасці і сардэчнасці.

Ці быў хто з вас у Сігулдзе? Ці бачыў імкліва-празрыстую раку, пячоры, равы, вежы замкаў і неверагодна раскошныя, як на палотнах ілжэрамантыкаў, лясы на схілах гор?

Калі мы спускаліся па волатавых уступах на дно Крумкачовага рова, з-пад нашых ног неахвотна адпаўзло маленькае вужаня з залатымі рыгсдалерамі на галоўцы. Яго прашчур, напэўна, бачыў таго цівуна, якога за жорсткасць кінулі на дно рова сяляне.

Сігулда выгодная ва ўсіх адносінах тым, што тут шмат равоў, і калі прыйдзе вораг, месца хопіць. Узяць хоць бы Кацёл Ведзьмаў — яму, у якой бруіць вада, а над ёю звісаюць брылы скамянелай гліны крывава-чырвонага колеру. Зручнае месца!

Відаць, разумеючы гэтую акалічнасць, ворагі і набудавалі тут калісь замкаў. У адзін з іх, Турайдскі, я і Геронім лезлі па адхоне ў сорак дзевяць градусаў ледзь не тры гадзіны. Для тых, хто штурмаваў замак, гэта была сапраўдная фіззарадка, асабліва калі ўлічыць, што даспехі важылі сама меней тры пуды.

— Як цяжка было штурмаваць крэпасці, - сказаў Геронім, трымаючыся за траву.

Я, аддыхаўшыся, апрытомнеўшы, дзве гадзіны лаяў шведаў, якія апошнімі сядзелі ў Турайдскім замку і, адступаючы, не ўзнялі яго ў паветра.

Потым я яшчэ гадзіну лаяў руплівых да старажытнасці латышоў, якія дбайна рэстаўрыравалі Турайдскую вежу і цяпер аднаўляюць палац каля яе. А чаму б не павучыцца ў нас і не забыць гэтыя помнікі, як забыліся мы пра Мірскі замак і Віцебскае Благавешчанне, якое за апошнія дзесяць год разбурылася больш, чым за ўсе папярэднія восем вякоў свайго існавання?

Прынамсі, турыстам было б спакойней.

Не тое, што ў Сігулдзе.

…Тут калісь было, кажучы словамі Эрскіна Калдуэла, "зашмат шведаў". Аж тры замкі на сігулдскую даліну: у Сігулдзе, на Турайдскай гары і яшчэ на нейкім узгорку, назву якога я забыў.

Я лазіў на самы верх Турайдскай вежы і быў да інфаркту так блізка, як гэта толькі магчыма. У вежы ёсць гарматы, рыцарскі камін, а з верхняй галерэі адкрываецца вачам цудоўны краявід. Толькі на ёй страшна дзьме. Нездарма шведы былі такія панурыя, не разумелі жартаў і пісалі змрочныя сагі.

Словам, шведы, пакідаючы гэтыя замкі, радаваліся, напэўна, не менш, чым латышы.

Вайна, наогул, не дае людзям радасці і ўзрошчвае ў душах самыя скажоныя і перакручаныя меркаванні аб тым, што такое гонар, правільнае асвятленне падзеі.

Дык вось… Шведы, напэўна, рады былі адпачыць ад перамог і стаць, нарэшце, звычайнымі людзьмі, якія не ўвесь час б'юць другіх.

Кажуць, у многіх шведскіх дамах вісіць на сцяне партрэт Пятра Першага. Турысты, асабліва нашы, здзіўляюцца:

— Вы што, любіце яго?

— За што? За тое, што ён біў нас?

— Дык нашто ж вісіць партрэт?

— Ды ён, ці ведаеце, адвучыў нас хадзіць на чужыя землі.

Што ж, тут ёсць нейкае рацыянальнае зерне. Хадзіць на чужыя землі не вельмі лёгка. Гэта азначае несці ўсялякі цяжар чалавека, падвышаць падаткі, выдаткоўваць порах, прыдатны на феерверкі, выхоўваць язычнікаў у духу братняй любві — аж да апошняга чалавека, ды яшчэ кожныя дзесяць год нанава перакрываць дах на сваім доме.

Дорага. Дрэнна. Значна лепей, калі чарапіца на даху ляжыць сто год. І таму з-пад майго пяра выходзіць апошняя янтарная казка…

…Казка пра чалавека, які ішоў у пекла

Тэн-турэнь… тэ-рэ-нэні… турэнь… Што азначае: "Спявала кокле[1] пад старымі вязамі…" Не якое-небудзь там неадгабляванае кокле, а сапраўднае даўняе кокле, упрыгожанае янтаром, як звонкае, як бор на дзюнах і як морскія хвалі… І спявала яно сумна, бо толькі што пракацілася па зямлі вялікая вайна, і нават муры дамоў не астылі ад агню і, распаленыя, свяцілі ў цемры трывожным вішнёвым агнём.

Нікога не асталося на Янтарнай зямлі.

…Чалавек выйшаў з лесу, падышоў да папялішча, уторкнуў у зямлю вілы і закалаціўся… Слёз у яго не было… Ён вярнуўся з вайны. Даўно не быў дома. А за гэты час — дрэвы расказалі яму пра гэта — вайна спустошыла ўсё, а жонку яго спалілі з домам. Таму чалавек маўчаў і калаціўся, а над яго галавою павольна кацілася ноч.

— Неба, як жа гэта ты? — моўчкі спытаў ён. Але неба не адказала.

— Зямля, як жа гэта ты?

Але маўчала і зямля. Зямля не можа абараніць сябе. Яе заўсёды абароняць яе сыны. Таму яна і маўчала.

І толькі першыя промні сонца, як суцяшэнне, пырснулі з-за лясоў на янтарныя палі… А як толькі прамень упаў на папялішча — там нешта радасна азвалася:

— Гулі-гулі-гулі.

І чалавек убачыў на горбачцы цёплага попелу замурзаную дзяўчынку з янтарнымі валасамі, сапраўдную Папялушку. Дзяўчынка радасна гулькала і трымала ў жменьцы верабейчыка.

Напэўна, маці, калі яе забіралі, схавала дзіця ў бур'ян і дала яму птушку, каб не плакала. А дзяўчынка, мусіць, прыпаўзла сама і пераначавала ў цёплым попеле.

— Што ж ты, гулюшка? — спытаў чалавек. Але дзяўчынка не адказала, не ўмела яшчэ гаварыць, затое адказаў верабей:

— Выпусці мяне, добры чалавек. Мне тут, вядома, добра, цёпла, але ж з голаду заходжуся. Адпусціш — сам пад'ем і дзяўчынку пакармлю.

Чалавек расшчапіў у дзяўчынкі руку, і верабей пырхнуў на галіну абпаленага дрэва.

— Дзякуй, — сказаў ён. — Век не забуду.

— Верабей, — сказаў чалавек, — зямля не адказала мне, неба

не адказала мне, як жа гэта?

— А пра што ты пытаў? — легкадумна азваўся верабей.

— А ці астаўся яшчэ хто жывы?

— Мала, — сказаў верабей. — А тых, што пабілі, не вернеш.

— Як, не вернеш? А калі сярод іх мая жонка? Як жа мне без яе? — І твар ягоны быў такі, што нават верабей задумаўся.

— Я нешта чуў, - нарэшце сказаў ён. — Старыя вераб'і ціўкалі, што там, куды цяпер пайшла Вайна, ёсць у зямлі правал. Гэта ўваход у пекла. Напэўна, і твая жонка там. Вось калі б ты змог спусціцца туды і вывесці душы нябожчыкаў зноў на зямлю… Але гэтага не рабіў яшчэ ніхто жывы.

— Усё роўна некаму трэба быць першым. Пайду я.

— А што табе дае сілу? — здзівіўся верабей.

— Там мая жонка. Я іду да яе. Паглядзі за дзіцем.

І чалавек пайшоў. Дарогу яму паказвалі сляды Вайны. Усюды чарнелі папялішчы. Усюды было нямое гора.

Ішоў ён вельмі доўга. Яшчэ здалёк убачыў чорны правал у зямлі, але раптам спыніўся.

На дарозе спала Вайна.

І чалавек падумаў, што дарэмна ён пойдзе ў пекла, пакуль яна жыве. Бо яна зноў прачнецца і зноў зжарэ ўсіх, і не будзе на зямлі спакою, пакуль яна тут.

Чалавек падняў самы цяжкі камень і апусціў яго на галаву пачвары. Аглушаная, яна ўсё ж усхапілася, і рык яе падобны быў на рык усіх гармат зямлі, вочы кідалі бліскавіцы, а з пашчы несла магілай.

Нарэшце яна ўпала ў крапіву, і чалавек, убачыўшы, што яго пакідаюць сілы, папрасіў:

— Крапіва, крапіва, памажы!

І крапіва — бо гэта была зямная крапіва — пачала звязваць пачвару. Калі Вайна была скручана моцнымі крапіўнымі вяроўкамі, чалавек узваліў яе на плечы і панёс у падземнае царства.

Гэта быў страшны шлях. Сэрца яго ледзянела, калі ён спускаўся ўсё ніжэй і ніжэй. Бачыў ён, як пакутавалі тыя, хто з-за грошай або велічы памагаў Вайне.

І раптам нечы голас:

— Глядзіце, глядзіце, гэта наш Жоўтавалосы.

А потым другі:

— Глядзіце, гэта Жоўтавалосы. Ён нясе скручаную Вайну.

Гэта гаварылі душы янтарных людзей.

Але вось нечы подых, пяшчотны, як ранішні ветрык, кранўў яго вочы.

— Гэта ты. Чаго ты тут?

— Я пазнаў цябе, — сказаў чалавек. — Я пазнаў бы цябе нават мёртвы.

— Куды ж ты?

— Я іду ў самае страшнае пекла. На самае дно. Ідзіце за мной.

Ён пайшоў, і ўсе галасы ляцелі за ім. І толькі адзін бязважка сядзеў на яго плячы і раз-пораз дакранаўся да яго валасоў.

І чалавек прыйшоў на самае дно, дзе холад і лёд; і там звалiў з плячэй сваю ношу.

На дне пекла тырчаў востры ледзяны слуп, і чалавек пасадзіў на яго Вайну, і слуп працяў яе навылёт; а потым чалавек прыкуў Вайну да сцяны жалезнымі ланцугамі. Яна ў адчаі грызла іх, пускаючы крывавую пену.

Чалавек ударыў яе нагою ў твар і сказаў усім душам нябожчыкаў:

— Вы вольныя, хадзем.

Але яны маўчалі. І толькі адзін голас, той, што быў на плячы, ціха азваўся:

— Не, мой любы, мы астанемся.

— Чаму?

— Ты бачыш, яна жывучая, як гад. Яна грызе. Калі ніхто не накіне на яе новых ланцугоў — яна вырвецца. Хто ж будзе пільнаваць Вайну, як не мы, бяссонныя, як не мы, забітыя ёю? У магілах мы праклінаем яе. На дне пекла мы праклінаем яе… І таму мы астанемся тут дзеля тых, што на зямлі.

— Тады і я астануся тут.

— Нашто? Ідзі на зямлю. Зноў зрабі яе прыдатнай, і ўзрадуюцца нашы душы.

— Але я не магу без цябе.

— Супакойся, яно нядоўгае, зямное жыццё. І тады ты прыйдзеш да мяне, і разам з табою мне будзе добра… Нават на дне… Ідзі. Любоўю нашай прашу.

Ён пайшоў. Галасы асталіся. І толькі адзін ляцеў з ім да самага выхаду, а потым яшчэ раз дакрануўся подыхам да яго вачэй.

— Даруй мне, што пакідаю цябе аднаго.

…Зноў было святло. Чалавек ішоў той самаю дарогай, на полі ўвіхаліся людзі, ачышчаючы свае загоны ад бур'яну.

Чалавек ішоў насустрач усходу, і слёзы высыхалі на ягоных шчоках.

. . . . . .

Гэтага яшчэ не было, але гэта будзе. Будзе!

І ўсё вернецца, усё забітае, усё забытае, усё растаптанае. Усё вернецца, дружа. Стане відушчы сляпы Індрыкіс, выйдзе з пячоры

і абдыме каханую Лат, ажыве забітая маланкай царэўна, парве свае ланцугі рыбак, і яны выйдуць з мора такія ж маладыя і прыгожыя, як некалі.

А на адноўленай званіцы Пятра заспявае срэбны пеўнік:

— Кокерыке! Уставай, Лат! Уставай, беларус! Сонца ідзе! Сонца ідзе!

Я прыдумаў гэтую казку на хутары Мелдры, апошнім маім прыстанку на латышскай зямлі. На маленькім хутары, які самім існаваннем сваім даводзіць, што можа зрабіць праца. Усё было. Былі акопы на балотах, краўся да гнёздаў ліс, былі крыўды і была несправядлівасць. І ўсё прайшло. Асталіся суровыя і добрыя людзі, астаўся дом, у якім нараджаюць дзяцей. Асталіся палі, што зелянеюць бульбай і кучаравяцца гарохам, добрыя стайні і адрыны і паважныя, як лорды, коні на зялёных лугах. Асталіся лопухі рэвеню пад яблынямі.

Была вечарынка. Спявалі песні. І мне хацелася ўзяць кожную песню і кінуць яе ў бязмежны свет, каб ён таксама быў добры да ўсіх, каб ніколі не ўпала на зямлю ніводная сляза крыўды.

Мелдры, трысцінкі мае! Трысцінкі горкай і добрай Янтарнай зямлі!

…Потым, калі я ўжо лёг, прыгожая жанчына, зусім як вядзецца на Беларусі, прынесла мне кубак бярозавага квасу. Я выпіў яго, адчуваючы, што сіле маёй цяпер няма граніцы.

Мне хацелася пацалаваць жанчыну, як гэта робяць у такіх выпадках на Беларусі, але я не ведаў, ці можна гэта, ці такі тут звычай, ці не асудзяць мяне.

Белая латышская ноч стаяла за акном. У прывідным святле млелі кучаравыя яблыні, а за імі фасфарычна прасвечвала возера, спакойнае, як малако.

Я ляжаў і думаў, што мне амаль немагчыма жыць, не любячы гэтай зямлі і сваёй радзімы, і што ў сэрцы маім яны цяпер неадрыўна звязаны повяззю, моцнай, як смерць, і вечнай, як жыццё.

Белая ноч над Янтарнай зямлёй! Ты вылечыла мяне. А можа, гэта зрабіла Янтарная зямля? Усё адно.

Я цяпер ведаю: трэба сурова сеяць свой хлеб, змагацца з градам і навальніцамі, спяваць і не звяртаць увагі на крушэнні, здрады і боль.

Ave Victis! Слава пераможаным. Бо яны не спяць, як не спіць парастак у зямлі.

Дзякуй табе, Янтарная зямля. За ўсё, што ты зрабіла, дзякуй табе.

Вечна блакітныя будуць за тваю дабрыню твае азёры, вечна магутныя будуць людзі на тваіх палях. Вечная будзе іх мудрая

мова. І вечна-вечна будзе смяяцца і плакаць кокле пад тваімі старымі вязамі.

notes

Примечания

1

Латышскі музычны інструмент. Род гусляў або цымбал.